*Іна Алексніна*

## ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫЗНАЧЭННЯ ЎЗРОЎНЮ ДАСЛЕДАВАНАСЦІ ФАЛЬКЛОРНА-ТЭАТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСАЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я

У асвятленні тэарэтыка-тэрміналагічнага аспекта даследавання тэатральна-фальклорнага выканальніцтва, вылучэння яго асноўных, адметных ад іншых відаў мастацтва прыкмет (дзеянне і пераўвасабленне) вялікая заслуга належыць В.Я. Гусеву [Истоки русского народного театра. – Л: Наука, 1977. – 187 с.]. Сама ж праблема пераўвасаблення, спосабы і сродкі яго дасягнення дастаткова поўна разглядаюцца мастацтвазнаўцамі Н.І. Савушкінай [Русский народный театр. – М: Наука, 1976. – 150 с.] і Л.М. Іўлёвай [Дотеатрально-игровые формы русского фольклора: проблема теории и типологии: Автореф. дис…. канд. искусствовед.: 17.00.01. / Гос. ин-т театра, музыки и кинематографии им. Н.К. Черкасова. – Л., 1985. – 21 с.].

У беларускім тэатразнаўстве фальклорна-тэатральнае выканальніцтва і яго сродкі закранаюць Г.І. Барышаў і А.К. Саннікаў [Беларускі народны тэатр батлейка і яго ўзаемасувязі з рускім вяртэпам і польскай шопкай // V з'езд славістаў: дакл. – Мінск: Б. в., 1963], даследчыца Д.У. Стэльмах [Сцэнічнае ўвасабленне народнай драмы // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1981. – № 2. – С. 98-104; Узнікненне і развіццё народнай драмы на Беларусі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1982. – № 6. – С. 92-98; Народная драма «Цар Максіміліян» і яе бытаванне на Беларусі // Беларуская літаратура. – Мінск: выд-ва БДУ імя У.І. Леніна, 1980. – Вып. 8. – С. 126-135]. І.І. Сучкоў разглядае гульнявыя формы беларускага фальклору [Театрально-игровые формы белорусского фольклора (Традиционное общение и современность): дис.... канд. искусствовед.: 17.00.01. – Утв. 29.11.89. – Минск; Л., 1988. – 191 с. – Библиогр. 172-191 с.].

На тэатральна-гульнявы аспект творчасці беларусаў звярталі ўвагу Я. Чачот, Я. і К. Тышкевічы, Я. Баршчэўскі, А. Багдановіч, П. Бяссонаў, Л. Грузінскі, М. Дзмітрыеў, Я. Карскі, М. Федароўскі, П. Шэйн, А. Семянтоўскі, Е. Раманаў, А. Кіркор, К. Машыньскі, А. Сержпутоўскі, А. Рыпінські, М. Нікіфароўскі. Пазней пытанні тэатральна-гульнявога выканальніцтва знайшло адлюстраванне ў працах А. Шлюбскага, П. Глебкі, С. Сахарава, Н. Гілевіча, Н. Нікольскага, Г. Гутарава, А. Гурскага, З. Мажэйкі, К. Кабашнікава, І. Назінай, Т. Кухаронак, А. Ліс, У. Сысова, В. Ліцьвінкі, А. Лозкі, П. і Н. Гуд.

У межах даследуемага намі рэгіёна да разгляду тэатральна-гульнявых формаў фальклору часткова звяртаюцца А. Драеўскі [Белорусы Дисненского уезда. – Вильно: Б. и., 1907. – 213 с.], Д. Зяленін [Описание рукописей учёного архива императорского русского географического общества. – СПб.: Б. и., 1914. – С. 108-127.], А. Сапуноў-Друцкі [Материалы по истории и географии Дисненского и Витебского уездов Виленской губернии / ред. А. Сапунов-Друцкий. – Витебск: Б. и., 1896. – 277 с.; Витебская старина. – Витебск: Б. и., 1883. – Т. 1. – 609 с.], В. Камінскі [Беларусы Дзісненскага павета Ковенскай губерніі ў іх песнях, абрадах, звычаях. – Вільня. – 1889. – 114 с.], Я. Драздовіч [Рукапісны сборнік беларускіх народных песень, 1930 // Рукапіс. – Бібліятэка НАН Беларусі, чыт. зала рукапісаў і рэдкай кнігі, 163 кадры; Рукапісы этнаграфічных матэрыялаў Дзісненшчыны. Піншчына. – 1930 // Рукапіс. – Бібліятэка НАН Беларусі, чыт. зала рукапісу і рэдкай кнігі, 510 кадраў], А. Чэрны [Piesni bieloruskie z powiatu Dzisninskiego gubernii Wilenskiej // Zbor Wiadomosci do Antropologii Krajowej. – Krakow, 1895. – T. 18. – S. 192-224.], Л. Цыбульскі [Цибульский Л.О. Опыт исследования одной волости (Поставской), по образцу которой предполагается описать Виленскую губернию. – Вильно: Б. и., 1902 – 164 с.].

У гістарычным аспекце тэатральна-гульнявыя формы беларускага фальклору разглядаліся Ф. Аляхновічам [Беларускі тэатр. – Вільна: выд-ва грамад. сабрання. – 1924. – 111 с.], З. Бядулем [Батлейка // Вестник народного комиссариата просвещ. БССР. – Мінск, 1922. – Вып. 9. – С. 5-6; Батлейка // Вестник народного комиссариата просвещ. БССР. – Мінск, 1922. – Вып. 10. – С. 5-8; Беларускі тэатр // Вестник народного комиссариата просвещ. БССР. – Мінск, 1922. – Вып. 3. – С. 5-6; Беларускі тэатр // Вестник народного комиссариата просвещ. БССР. – Мінск, 1922. – Вып. 4. – С. 5-8; Беларускія інтэрмедыі і інтэрлюдыі да школьнай драмы і камедыі ў XVII–XVIII стагоддзях // Вестник народного комиссариата просвещ. БССР. – Мінск, 1922. – Вып. 11. – С. 26; Беларускія інтэрмедыі і інтэрлюдыі да школьнай драмы і камедыі ў XVII–XVIII стагоддзях // Вестник народного комиссариата просвещ. БССР. – Мінск, 1922. – Вып. 12. – С. 26], М. Каладзінскім [Народны тэатр / уклад. і уступ. частка М.А. Каладзінскага; рэдкал. В.І. Бандарчык і інш; рэд. тома А.С. Фядосік, А.В. Сабалеўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, – 1983. – 511 с.; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. / гал. рэд. У.І. Няфёд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – Т. 1 : Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 года. – 496 с.;], У. Няфёдам [Беларускі тэатр: Нарысы гісторыі. – Мінск: Выд-ва АН БССР. – 1959. – 400 с.], С.М. Місько [Истоки белорусского народного театра. – Минск: Наука и техника, 1962. – 152 с.].

Першая спроба зрабіць навукова-абгрунтаванае даследаванне тэатральна-фальклорнай традыцыі аднаго «лакальнага раёна» Беларусі (Гомельшчыны) і яе захавання быў зроблены М.Ф. Макарцовым [Каб не перасыхала крыніца: фальклорная традыцыя на Гомельшчыне. – Гомель, 1994. – 62 с.]. Другой такой спробай даследавання тэатральнага фальклору беларусаў – жыхароў Заходняга Паазер'я (зноў жа з выкарыстаннем сінхрона-дыяхронага падыходу) было дысертацыйнае даследаванне аўтара гэтага артыкула [Тэатральная культура беларусаў Заходняга Паазер'я: спадчына і сучаснасць: дыс... канд. мастацтвазнаўства: 17.00.01 – Тэатральнае мастацтва / ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі – Мінск, 2000. – 113 с. – С. 30-60].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, падводзячы вынікі кароткаму агляду гістарыяграфіі даследаследавання тэатральна-фальклорнага выканальніцтва ў розных рэгёнах Беларусі (як буйных, так і лакальных), можна зрабіць выснову, што і ў XXI стагоддзі найбольш даследаванымі беларускімі навукоўцамі застаюцца музычны, песенны і, крыху ў меншай ступені, харэаграфічны фальклор жыхароў нашай краіны. Мэтанакіраванае сінхронна-дыяхронае даследаванне тэатральнага фальклору жыхароў розных куткоў Беларусі па ранейшаму чакае свайго даследчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ